3. Гофштеттер, И. Накануне исхода (По поводу рассказов С. Юшкевича) / И. Гофштеттер // Наука и жизнь. — 1904. — № 5–8. — С. 875–900.

4. Письмо: Горький М. — Амфитеатрову А. В. (конец января 1907 г.) // Горький и русская журналистика начала XX века: Неизданная переписка / Отв. ред.: И. С. Зильберштейн, Н. И. Дикушина. — М., 1988. — С. 14. (Литерат. наследство. — Т. 95)

5. Львов-Рогачевский, В.Л. Д. Я. Айзман / В. Львов-Рогачевский // Львов-Рогачевский, В.Л. Русско-еврейская литература. — М., 1924. — С. 116-117.

6. Голос войны // Лехаим. — 2008. – №4 (апрель). — С.192.

7. Краткая литературная энциклопедия: в 9 т. / ред. совет: А. А. Сурков. (гл. ред.) [и др.] — М., 1962. — Т.2. — 1964. — С. 829.

8. Ратнер, А. В. Осипович Н. М.: биографическая справка / А. В. Ратнер // Русские писатели: 1800-1917; биограф. словарь / Гл. ред. П. А. Николаев. — М., СПб., 1999. — Т. 4. — С.704.

9. Талмуд, Менахот 53b

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Качан К. Д., студент 131 группы
Научный руководитель – Друк Г. М.,
кандидат филологических наук, доцент

## ІДЭЙНА-МАСТАЦКІ АНАЛІЗ РАМАНА В. ГАПЕЕВА «ПАЗЛ»

«Што мы ведаем пра свае скрыжаванні? Пра
тое, як паступаць з людзьмі, якіх сустрэлі там?»
(В.Гапееў «Пазл»)

У беларускай літаратуры Валеры Гапееў стаў вядомы з 90-х гг. XX ст. і хутка набыў аўтарытэт арыгінальнага прадстаўніка дзіцячай, у прыватнасці, падлеткавай літаратуры. Такія зборнікі прозы як “Пастка на

рыцара”, “Урокі першага кахання” і інш. палюбіліся чытачу. За першы з іх аўтар атрымаў лаўрэата літаратурнай прэміі імя У. Калесніка ў намінацыі “Дзіцячая літаратура”. Апошнія гады засведчылі зварот В.Гапеева да чытацкай аўдыторыі іншага ўзросту, а такія творы як “Праклён”, “Ноч цмока”, “Пазл” не засталіся без увагі ні радавых чытачоў, ні прафесійных крытыкаў.

Раман В.Гапеева “Пазл” (2018) зацікавіў нас не толькі сваім зместам, але і адметнай мастацкай формай. Ён складаецца з асобных фрагментаў-апавяданняў, “кожны з якіх – самадастатковы аповед, і кожны хвастом чапляецца за шыю наступнага” [1], і толькі пры ўмове поўнага прачытання тэксту ствараецца цэласная жывая карціна светабыцця. Зварот да аналізу гэтага рамана абумоўлены таксама пераважна станоўчымі водгукамі спецыялістаў, якія адзначаюць сярод лепшых мастацкіх рысаў праўдападабенства герояў, “пазнавальнасць” канкрэтных падзей, дынамічнасць і вастрыню сюжэту, яго непрадказальнасць, умелае ўключэнне містыкі ў рэалістычны паказ і інш. У якасці прыкладу праілюструем гэта цытатай аўтарытэтнага даследчыка сучаснай беларускай літаратуры Г.Кісліцынай з рэцэнзіі на раман: “…пачынаеш чытаць і забываеш, што перад табой мастацкі вымысел”, “сочыш за героямі так, быццам яны – твае знаёмыя ці суседзі, або, па крайняй меры, знаёмыя суседзяў” [4].

Дзеянне ў рамане адбываецца ў сучасным беларускім горадзе. Віктар Анішчук, звычайны малады чалавек, які толькі прыйшоў з арміі, уладкаваўся на добрую працу, марыць пра вучобу, але і дзяўчат не абыходзіць увагай. Пасля блізкіх стасункаў з Ніначкай, даведаўшыся, што тая зацяжарыла, адмаўляецца ад стварэння сям’і. Дзяўчына пазбаўляецца дзіцяці. Прашло шмат год. Віктар Анішчук – старанны работнік, добры сем'янін, у імгненне пазбаўляецца ўсяго: сына, жонкі, добрага становішча. Ён ніяк не можа зразумець: за якія ўчынкі на яго долю выпадае столькі гора.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Раман “Пазл” – твор шматпраблемны, але найважнейшымі бачацца пытанні выбару чалавека і барацьбы дабра са злом. Рэалізоўваюцца яны ў творы пры дапамозе містыкі, якая “падсвечвае” канкрэтную рэальнасць і дапамагае ўявіць яе больш аб’ёмна і ярка, успрыняць глыбей, па-філасофску. І праяўляе яна сябе, пачынаючы з першых старонак аповеду да апошняга сказа ў творы. Цікава тое, што містычнае як бы выпадкова чапляе адну падзею за другой: Ніначка робіць няўдалую спробу магічнай адсушкі пачуццяў да Віктара на могілках, праз шмат гадоў на могілках энцэфалітны клешч кусае сына таго самага Віктара. А Віктар, у сваю чаргу, таксама вяртаецца да могілак, каб адпомсціць за смерць жонкі і загубленае жыццё сына. Гэтыя “выпадковасці” звязваюць у сюжэце ў адно цэлае жыцці многіх людзей і паказваюць, як на лёс аднаго чалавека ўплываюць жыццёвыя шляхі іншых. Віктар Анішчук, галоўны герой твора, разважае: “Па сутнасці ён – ніхто ў гэтых гісторыях. Ён – толькі маленькая дэталька, ягоны пясок – адна з соцень выпадковасцей, якія сабраліся ў кожным выпадку ў адну вялікую ліхасць” [2, с. 292]. Раман “Пазл” пра тое, што можа адбыцца з намі, калі кожны забудзе пра гэта і стане кіравацца толькі ўласнымі інтарэсамі, сваім эгаізмам, індывідуальным практыцызмам.

У многіх водгуках на раман вылучаны як вядучы матыў зместу – пакаранне кожнага чалавека за зробленыя ім грахі. Ды і ў творы пра гэта адкрыта гаворыцца: “Калі кожны будзе знаць, што яму давядзецца адказваць за свае справункі, от тады будзе лад” [2, с. 193]. Але мы звяртаем увагу на тое, што ў герояў былі “вольныя”, свядомыя грахі. Амаль кожны з дзеючых персанажаў на працягу твора свае непрывабныя ўчынкі спісвае на тое, што ён “проста маленькі чалавек”, зрабіць нічога не можа, паступіць іначай у пэўнай сітуацыі не можа. Напрыклад, “Я вельмі шкадую. Але я – чалавек службовы. Так атрымалася”, – канстатуе Сяргей Манько, участковы міліцыянер [2, с. 253]. Падобнага зместу фразы можна пачуць з вуснаў многіх. Адсутнасць жадання прызнаць сваю адказнасць “за ўсіх і ўсё: за зерне і дзіця” (П.Панчанка) прыводзіць да драматычных ці, нават, трагічных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вынікаў. За памылкі выбару бацькоў, мужоў, мацярок адказваюць свае ж родзічы. У творы так здарылася амаль ва ўсіх сем'ях: у Віктара Анішчука загінула жонка, страшна захварэў сын, ва ўчастковага Сяргея Манько таксама пацярпела жонка, у суддзі паплаціліся дзеці, у галоўрача, хутчэй за ўсё, – яшчэ ненароджанае дзіця.

Адной з асаблівых дэталяў у рамане становіцца паказ прычынаў раўнадушных паводзінаў герояў, якія не з'яўляюцца цалкам нелюдзямі. Нельга адназначна сказаць пра Віктара Анішчука – станоўчы ён ці адмоўны. Як і пра ўсіх герояў гэтага рамана. Малады Віктар імкнецца да вучобы, хоча адбыцца ў прафесіі, "разумны, разважлівы, сур'ёзны хлопец – такім падаўся на пачатку" [2, с. 3] Ніначцы. Але калі дзяўчына зацяжарыла, то ён лёгка, асабліва не задумваючыся вырашыў пытанне, зняўшы з сябе адказнасць: "Сёння хіба праблема – аборт? – здзівіўся Віктар, бы спыталася пра глупства нейкае, усім вядомае…" [2, с. 5]. І на працягу жыцця гэта справа ніяк не хвалявала героя, бо ён рэалізаваў сябе так, як і запланаваў першапачаткова: стаў выдатным архітэктарам, клапатлівым мужам, любячым бацькам. І пакуль ён не страціў блізкіх, то не шукаў справядлівасці адносна сваёй жыццёвай сітуацыі. Дзіўна з маральна-рэлігійнага гледжання, што нават тады Віктар не перажывае жадання пакаяцца ў гібелі ўласнага ненароджанага дзіцяці: "Мы былі маладыя і дурныя, у нас не было б ніяк сям'і, дый урэшце я ж яе не прымушаў аборт рабіць, нарадзіла б – хто ведае, мо й жылі б" [2, с. 286]. Вобраз і характар гэтага героя змяняецца на працягу ўсягу рамана ў залежнасці ад жыццёвых абставін, у якіх ён апынаецца. Паводле думкі Г.Кісліцынай, раман В.Гапеева пабудаваны як раман-разважанне, у якім бадай што галоўнае пытанне "наколькі мы свабодныя ў сваім выбары і як гэты выбар можа адлюстроўвацца на іншых людзях" [4].

Важна тое, што праз паказ жыццёвай трагедыі Віктара Анішчука пісьменнікам створаны ў рамане сацыяльны, духоўны партрэт сучаснага грамадства не менш трагічнага настрою. У творы выразна адчуваюцца экзістэнцыяльныя матывы – адзінота Анішчука, які ў канцы твора

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перасяляецца з горада ў хату наводшыбе, адчай, што запаланяе яго ў многіх эпізодах, адчуванне поўнай безвыходнасці, калі ён жадае дамагчыся праўды, і інш. Складваецца ўражанне, што галоўнае супрацьпастаўленне ў рамане – гэта чалавек, асобны індывід і ўся сістэма, у якой "рука руку мые", сувязі і блат вырашаюць калі не ўсё, то шмат чаго. Напрыклад, нявестка прадпрымальніка, уладальніка рэстарана Сыноўца Хрысціна, якую злавілі п'янай за рулём аўто, не была пакарана: "Разбяромся. Начальніку пазваню. Ён казаў, увосень вяселле ў дачкі, маладыя ў рэстаране Сыноўца хочуць святкаваць… Цяміш? Ну дык вось" [1, с. 150]. Згадаем аб просьбе галоўурача бальніцы Мікалая Вашчылы да начальніка міліцыі "закрыць" Віктара Анішчука "па поўнай". Ваенкам Фёдар Тарасенкаў за будаўнічыя матэрыялы для дома пайшоў на злачынства: "Слухай,пакінь мне хлопца на паўгода, за дзве гадзіны ў цябе і два кубы дошак будзе, і бруска куб, і яшчэ шалёўкі закінуць хлопцы на цяплічку. Свае жлюдзі, разлічышся пазней, як будуць грошы" [1, с.27]. І такіх выпадкаў на працягу твора будзе шмат.

Мы згодны з меркаваннем З.Драздовай, якая піша аб тым, што Валеры Гапееў у сваіх творах ввыкарыстоўвае магутныя сродкі эмацыянальнага ўздзеяння на чытача. Гэта псіхалагічныя партрэты герояў,унутраныя маналогі і няўласна-простая мова як спосаб мастацкага пранікнення ў глыбіні чалавечай псіхікі, мімічны псіхалагізм (міміка, жэсты, смех, манера гаварыць), дыялог, псіхалагічны пейзаж, псіхалагічная дэталь, сны герояў,свет рэчаў і прадметаў, якія акружаюць герояў [3, с. 7]. "Сніла сёння: вялікая-вялікая чорная птушка сядзела ў адкрытым акне і глядзела на мяне. Вусцішна стала, хацела яе прагнаць, падышла, а тут не птушка, а полымя барвовае, ды ў мой бок як шугане…" [1, с. 30] –гэта сон Антаніны Анішчук, які стаў прадвеснікам бяды.

"Нечакана падняўся вецер, халодны, працінаў на скрозь" [1, с. 3], "А вецер хапаў за ногі, лез пад спаднічку, біў наўскос, сляпіў вочы…" [1, с. 4] – менавіта такім мы бачым пейзаж у пачатку твора, калі Ніначка думае пра аборт. "Жудасць і жаль былі ў вачах жанчыны, якія расплюшчыліся шырока,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ажно сталі пукатымі, і неспадзявана як пасунуліся долу – доктарка стала апускацца на тратуар, бы ей адмовілі ногі” [1, с. 315] – так аўтар перадаў страх Ларысы Стральчак у эпізодзе сустрэчы з Віктарам, у сына якога яна, урач-тэрапеўт, не выявіла прыкметы хваробы, што прывяло ў будучым да яго смерці.

Такім чынам, у аснове ідэйна-мастацкага свету рамана В.Гапеева “Пазл” думка аб тым, што жыццё – своеасаблівая гульня-галаваломка, якая вучыць чалавека знаходзіць сувязі паміж прыватным і агульным, індывідуальным і калектыўным, імгненным і вечным і правільна іх успрымаць. Аўтар паказвае, што адбываецца гэта ў жыцці часта, на жаль, толькі ў выніку перажытай індывідуальна трагедыі.

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Бабіна, Н., Скурко, П. Добра і для многіх: новы раман Гапеева “Пазл” / Н. Бабіна, П. Скурко // Наша ніва [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://nn.by/?c=ar&i=226593 – Дата доступу: 17.02.2021

2. Гапееў, В. Пазл / В.Гапееў. – Мінск: “Галіяфы”. – 2018. – 330 с.

3. Драздова, З. Проза Валерыя Гапеева: праблема псіхалагізму / З.Драздова // Полымя. – 2020. – № 7. – С. 5–15.

4. Кислицына, А. Пять убийств в провинции. Почему стоит читать книгу Валерия Гапеева / А.Кислицына // Рэжым доступу: https://news.tut.by/culture/628445.html – Дата доступу: 17.02.2021

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Киневич А. А., студент 320с группы

Научный руководитель – Гутковская С. В.,

кандидат филологических наук, доцент

# КИНОТАНЕЦ В ЭПОХУ РАЗВИТИЯ КОМПЬЮТЕРНЫХ ТЕХНОЛОГИЙ